Таким образом, следует отметить, что архивные материалы всегда являлись и являются незаменимыми источниками при изучении исторических тем. Они служат основой для выдвижения научных гипотез и их доказательства. Рассмотренные фонды являются необходимыми источниками для изучения развития общеобразовательной школы на Витебщине в 1920 – 1930-е гг. ХХ ст.


1. Государственный архив Витебской области (ГАВО), ф.1737, оп.1
2. Там же, ф.246, оп.1
3. Там же, ф.170,оп.1
4. Там же, ф.813, оп.1
5. Там же, ф.102-п, оп.1
6. Там же, ф.10050-п, оп.1
7. Там же, ф.10051-п, оп.1


**Карпекін К.Р.**

## САВЕЦКІ ПЕРЫЯДЫЧНЫ ДРУК ЯК КРЫНІЦА ПА ГІСТОРЫІ ІУДЗЕЙСКІХ АБШЧЫН БЕЛАРУСІ Ў 1919–1939 гг.

Паводле стану на 1917 г., на тэрыторыі Беларусі знаходзілася 704 сінагогі, вакол якіх групаваліся яўрэйскія рэлігійныя абшчыны. Савецкая палітыка прывяла да скарачэння іх колькасці. У 1933 г. у БССР засталося 287 дзеючых сінагог і малітоўных дамоў, а ў канцы 1936 г. – 71. Адносіны паміж савецкай уладай і іудзейскай рэлігіяй знайшлі сваё адлюстраванне ў перыядычным друку таго часу. Мэта даследавання – вызначыць асноўныя характарыстыкі савецкага перыядычнага друку як крыніцы па гісторыі іудзейскіх абшчын Беларусі ў 1919 – 1939 гг. Дзеля гэтага быў прааналізаваны шэраг агульнасаюзных, рэспубліканскіх і мясцовых выданняў, якія распаўсюджваліся на тэрыторыі БССР.

У якасці прыкладу агульнасаюзнага выдання прааналізаваны часопіс “Антырэлігійнік” – друкаваны орган Цэнтральнага Савета Саюза ваяўнічых бязбожнікаў (СВБ). Усе матэрыялы, якія былі змешчаны тут і датычыліся гісторыі іудзейскіх абшчын, можна падзяліць на тры катэгорыі. Да першай адносяцца артыкулы, у якіх апісваецца ход кампаній, накіраваных на змяншэнне ролі рэлігіі ў жыцці яўрэйскага насельніцтва, праводзімых членамі СВБ. Прыкладамі апісанняў такіх кампаній могуць служыць звесткі пра мерапрыемствы, праводзімыя мінскай арганізацыяй СВБ, аповед пра дзейнасць антырэлігійнікаў ў м. Свержань Рагачоўскага павета летам – восенню 1927 г. (імі былі праведзены вечарына жывой газеты, шэраг дакладаў, арганізаваны атэістычны гурток) [7, с. 59 – 60]. Падобныя матэрыялы важныя для разумення адносін савецкай улады і камуністычнай партыі да іудзейскіх абшчын, а таксама для вывучэння тактыкі барацьбы з рэлігійным светапоглядам. Цікавымі з’яўляюцца падборкі невялікіх паведамленняў пра правядзенне антырэлігійных кампаній. У некаторых нумарах часопіса былі змешчаны звесткі пра антыпэйсаховыя вечарыны, сходы ў Бабруйску, Барысаве, Мінску, Слуцку, Тураве, пра адмаўленне яўрэяў Мазыра, Полацка пячы мацу, пра жаданне рабочых зачыніць сінагогі ў Полацку, Старых Дарогах, Талачыне [12, с. 33 – 34; 15, с. 40 – 41]. Трапляюцца ў дадзеных падборках і звесткі пра дзейнасць рабінаў, іх імкненне захаваць рэлігійныя традыцыі яўрэяў. У прыватнасці, ёсць паведамленні пра рабінаў Жлобіна, Клімавічаў, Магілёва, Турава [12, с. 35].

Да другой катэгорыі артыкулаў, змешчаных у “Антырэлігійніку”, варта аднесці агітацыйныя тэзісы, матэрыялы, якія раілася выкарыстоўваць пад час кампаній супраць святаў Пэйсах, Рош-Гашана, Іом-Кіпур.

Нарэшце, да трэцяй катэгорыі матэрыялаў трэба залічыць тыя з іх, што былі прысвечаны тэарэтычным асновам дзейнасці СВБ: вызначалі структуру саюза (у тым ліку месца яўрэйскіх секцый у гэтай структуры), прынцыпы разгортвання працы Саюза і асаблівасці яе правядзення сярод яўрэяў.

Што датычыцца беларускіх рэспубліканскіх выданняў, то матэрыялы па становішчы іудзейскіх абшчын у савецкім грамадстве ўтрымліваюцца ў такіх з іх, як “Ка-

Рэпазіторый ВДУ

муніст” (газета ЦК Кампартыі Літвы і Беларусі), “Бальшавіцкі друк” (часопіс ЦК КП(б)Б), “Маладняк” (часопіс ЦК ЛКСМБ), “Асвета” (часопіс Народнага камісарыята асветы БССР).

Так, у газеце “Камуніст” быў надрукаваны шэраг матэрыялаў, якія крайне негатыўна ацэньвалі дзейнасць рабінаў у рэспубліцы. У адным з іх зазначалася: “Папы, ксяндзы і рабіны сказалі народу: “Бог пакараў нас за грахі нашы. Пастом і малітвай мы павінны замаліваць нашы цяжкія грахі”. І веруючыя ішлі за сваімі настаўнікамі ў цэрквы, касцёлы і сінагогі, здзяйснялі зямныя паклоны, паўтаралі да атупення незразумелыя малітвы і рабілі тысячы глупстваў замест таго, каб выйсці на вуліцы з зброяй у руках, для барацьбы супраць сапраўдных ворагаў і прыгнятальнікаў народа” [6, с. 1].

Матэрыялы, якія з’явіліся на старонках друкаваных органаў ЦК КП(б)Б і ЦК ЛКСМБ, таксама былі скіраваны ў першую чаргу на падштурхоўванне яўрэйскага насельніцтва да адыходу ад рэлігійных традыцый. У прыватнасці, былі артыкулы пра разгортванне антырэлігійнай агітацыі праз перыядычны друк на Магілёўшчыне [4, с. 28]. У “Маладняку” змяшчаліся матэрыялы, прысвечаныя антырэлігійнай дзейнасці яўрэйскай секцыі Беларускай асацыяцыі пралетарскіх пісьменнікаў – антырэлігійным літаратурным выступленням пісьменнікаў і паэтаў у Капцэвічах, Мазыры, Мінску [16, с. 141].

У часопісе “Асвета” маюцца звесткі, важныя для вывучэння становішча хедараў (пачатковых іудзейскіх навучальных устаноў). У прыватнасці – інфармацыя пра месцазнаходжанне хедараў Бабруйскай акругі і лік навучэнцаў у кожным з іх. Тут жа змешчаны паведамленні пра прыстасаванне меламедаў (настаўнікаў хедараў) да новых умоў існавання. Пасля забароны выкладаць асновы рэлігійных ведаў у пастаянна функцыянуючых установах яны сталі праводзіць заняткі з невялікімі групамі дзяцей. Пры гэтым дзеці нярэдка наведвалі і хедары, і савецкія яўрэйскія школы [11, с. 126 – 127]. Адначасова ў часопісе друкаваліся парады і метадычныя рэкамендацыі па выяўленні дзяцей-навучэнцаў хедараў (у прыватнасці, была распрацавана спецыяльная анкета з мэтай вывучэння рэлігійнасці вучняў), указанні па паляпшэнні сістэмы савецкай адукацыі. Напрыклад, раілася паляпшаць матэрыяльную базу савецкіх школ, уводзіць навучанне на мове ідыш, прымаць на працу кваліфікаваных настаўнікаў. Акрамя праблем традыцыйнай яўрэйскай адукацыі з дапамогай часопіса “Асвета” магчыма прасачыць лёс маёмасці іудзейскіх абшчын (скруткаў Торы, дзевяцісвечнікаў, амулетаў), частка з якіх трапляла ў беларускія музеі [8, с. 134].

Матэрыялы пра розныя аспекты жыцця іудзейскіх абшчын БССР у 1919 – 1939 гг. маюцца ў мясцовым перыядычным друку. Пры правядзенні дадзенага даследавання былі апрацаваны газеты: “Весткі Віцебскага губвыканкама і губкама РКП(б)”, “Палеская праўда” (выдавалася ў Гомельскай губерні), “Камуніст” (друкаваны орган Бабруйскага павятовага выканкама і павятовага камітэта КП(б)Б), “Саха і молат” (Магілёўскае павятовае выданне), “Зара Захаду” з дадаткам на ідышы “Віцебскі рабочы” (выдаваліся ў Віцебскай акрузе). Трэба адзначыць, што тут, як і ў агульнасаюзных, рэспубліканскіх выданнях, інфармацыя пададзена праз прызму антырэлігійнай палітыкі таго часу.

Напрыклад, маюцца звесткі пра закрыццё сінагог і яўрэйскіх малітоўных дамоў у гарадах і мястэчках рэспублікі. Як правіла, такія артыкулы мелі форму рэзалюцый, хадайніцтваў рабочых пра неабходнасць скарачэння колькасці культавых будынкаў і перадачу іх пад савецкія ўстановы [14, с. 4]. Найбольш актыўна аналагічныя матэрыялы з’яўляліся ў друку пад час кампаніі 1929 – 1930 гг. па закрыцці сінагог [1, с. 2].

З дапамогай мясцовага перыядычнага друку магчыма вывучаць ход кампаніі па канфіскацыі каштоўнасцяў 1922 г. У газетах адлюстраваны ўсе асноўныя этапы гэтага мерапрыемства. Тут былі змешчаны аб’явы пра арганізацыю губернскіх камісій па канфіскацыі каштоўнасцяў, іх асноўныя функцыі, рэзалюцыі сходаў гараджан пра неабходнасць ажыццяўлення гэтага мерапрыемства. Напрыклад, у заяве чырвонаармейцаў аўтабранявога атрада Віцебска адзначалася: “Сход ганьбіць тых, хто



Рэпазіторый ВДУ

чыніць перашкоды канфіскацыі каштоўнасцяў, становячыся тым самым забойцамі галодных. Чырвоныя браневікі патрабуюць ад Віцгубсавета, каб выняцце каштоўнасцў з цэркваў, сінагог, касцёлаў і малітоўных дамоў было праведзена цвёрдай рукой без усялякага маруджання і паслаблення" [5, с. 2]. Адначасова ў перыёдыцы змяшчаліся адозвы беларускіх рабінаў, накіраваныя да вернікаў, якія былі сугучнымі з палітыкай савецкай улады. У гэтых адозвах лідары іудзейскіх абшчын заклікалі ахвяраваць усе каштоўнасці на справу выратавання галадаючых. Вялікую цікавасць уяўляюць звесткі пра вынікі канфіскацый з сінагог. Яны дазваляюць удакладніць вагу забраных срэбных рэчаў у кожным горадзе, тэрміны правядзення канфіскацый [10].

Шэраг матэрыялаў, змешчаных у мясцовым перыядычным друку, адлюстроўвае адносіны савецкай улады да іудзейскіх свят і абрадаў. У выданнях пачатку 1920-х гг. сустракаюцца паведамленні пра тое, што некаторыя яўрэйскія рэлігійныя святы з'яўляліся выхаднымі днямі, аб'явы рабінаў пра продаж пэйсаховага віна [13, с. 2], што сведчыць пра адносна лаяльнае стаўленне савецкай улады да рэлігійных традыцый у гэты час. Адначасова у перыядычным друку змяшчаліся матэрыялы пра ход антырэлігійных мерапрыемтваў у гарадах і мястэчках. У прыватнасці, у перыядычным друку асвячаліся кампаніі супраць суботняга адпачынку [18, с. 1], супраць выпечкі і ўжывання мацы на Пэйсах [17, с. 2], супраць святкавання асенніх іудзейскіх святаў Рош-Гашана і Іом-Кіпур [20, с. 2]. У дадатак да гэтага напярэдадні святаў у перыядычных выданнях друкаваліся агітацыйныя матэрыялы, тэзісы для выступленняў агітатараў, у якіх рэлігійныя традыцыі яўрэяў характарызаваліся з адмоўнага боку.

З мясцовых выданняў можна атрымаць звесткі пра колькасць служыцеляў іудзейскага культу (рабінаў, рэзнікаў, кантараў, магідаў) [19, с. 1], а таксама пра іх дзейнасць па захаванні іудзейскіх традыцый. Апошняя выклікала незадавальненне з боку савецкіх і партыйных органаў. Тыповай для 1920-х – 1930-х гг. была такая ацэнка дзейнасці рабінаў: "Яны ў апошні час, што называецца, разбэсціліся і адкрыта павялі шалёную працу па аб'яднанні ўсіх рэакцыйных і косных элементаў яўрэйскай буйной і дробнай буржуазіі супраць прадпрымаемых Савецкай уладай мер барацьбы з рэшткамі сярэднявечча і варварства..." [9, с. 1].

Дзякуючы мясцоваму перыядычнаму друку магчыма вывучаць стан яўрэйскай рэлігійнай адукацыі, адносіны да яе савецкай улады. У газетах пачатку 1920-х гг. змяшчаліся афіцыйныя распараджэнні пра закрыццё хедараў, талмуд-тор, ешыботаў, звесткі пра агітацыйныя мерапрыемствы супраць гэтых навучальных устаноў. Прыкладам могуць быць артыкулы пра лятучыя мітынгі ў мястэчках Магілёўскага павета: Дзебрах, Дубровенцы, Лупалаве, суды над хедарамі ў Магілёве, Чачэрску, вечарыну дакладаў у Гомелі [2, с. 3]. Указаныя артыкулы былі напісаны ў тым рэчышчы, што "хедары з'яўляюцца, паводле саёй сутнасці, рэлігійнымі школамі, у якіх выкладаюцца прадметы, зусім непрымальныя для дзіцяці, недапусцімыя з пункту погляду педагагічнага і якія супярэчаць духу і прынцыпам працоўнай школы" [3, с. 2].

Такім чынам, звесткі па гісторыі іудзейскіх абшчын Беларусі ў 1919 – 1939 гг. маюцца як у агульнасаюзным, рэспубліканскім, так і ў мясцовым перыядычным друку. На працягу даследуемага перыяду тут змяшчаліся матэрыялы пра працэс закрыцця сінагог, кампанію канфіскацыі каштоўнасцяў 1922 г., змаганне савецкай улады і камуністычнай партыі з іудзейскімі традыцыямі і святочнымі абрадамі, а таксама пра дзейнасць СВБ, служыцеляў іудзейскага культу і стан сістэмы яўрэйскай рэлігійнай адукацыі, іншымі словамі, пра ўсе асноўныя аспекты жыцця іудзейскіх абшчын. Выяўленыя матэрыялы маюць агітацыйны, антырэлігійны характар, яны змяшчаліся ў перыядычным друку ў сувязі з правядзеннем пэўных кампаній, накіраваных на змяншэнне ролі рэлігіі ў яўрэйскім асяроддзі. Нягледзячы на спецыфіку падачы матэрыялу, савецкі перыядычны друк з'яўляецца важнай крыніцай для вывучэння гісторыі іудзейскіх абшчын Беларусі ў 1919 – 1939 гг.

Рэпазіторый ВДУ

1. Вал. Рабочыя “Самаходзь” патрабуюць / Вал. // Заря Запада. – 1929. – 3 апр.; Міркін. Царквi і сінагогі непатрэбны / Міркін // Там же; Зварот рабочых працкалектыву шорнікаў да рабочых п.-к. “Прагрэс” // Там же.
2. В.Ш. Вечер докладов о хедере / В.Ш. // Полесская правда. – 1922. – 21 июня.
3. И.С. К суду над хедером / И.С. // Соха и молот. – 1921. – 19 февр.
4. Кабакоў, Н. Падрыхтаваць кадры, узмацніць штодзённае кіраўніцтва / Н. Кабакоў // Большэвіцкі друк. – 1934. – №8.
5. Красноармейцы авто-броневого отряда об изъятии ценностей // Известия Витебского губисполкома и Губкома РКП(б). – 1922. – 2 апр.
6. Лазарев, Н. Религия есть частное дело / Н. Лазарев // Коммунист. – 1919. – 14 февр.
7. Лапан, С. Опыт антирелигиозной работы / С. Лапан // Антирелигиозник. – 1927. – №11.
8. Ластоўскі, В. Музэйнае будаўніцтва ў БССР / В. Ластоўскі // Асьвета. – 1927. – №7.
9. М.Х. «Тихоновцы иудейского вероисповедания» / М.Х. // Полесская правда. – 1922. – 6 июня.
10. Полесская правда. – 1922. – 29 апр.; 4 мая; 5 мая; 23 мая.
11. Розэнфельд, П. Барацьба з хэдэрам і русіфікацыйнымі настроямі ў яўрэйскай школе на Барысаўшчыне / П. Розэнфельд // Асьвета. – 1927. – №3.
12. Розенфельд, П. К итогам кампании против иудейской пасхи / П. Розенфельд // Антирелигиозник. – 1935. – №3.
13. Соха и молот. – 1921. – 24 апр.
14. Три синагоги переданы рабочим // Коммунист. – 1923. – 14 марта.
15. Хаитов, Л. Кампания против иудейской пасхи (Обзор местной печати) / Л. Хаитов // Антирелигиозник. – 1936. – №3.
16. Хроніка // Маладняк. – 1929. – №5/6.
17. Х-ски. И с мацой пора покончить / Х-ски // Заря Запада. – 1929. – 29 марта; Хомечный. Новоиспечённая «артель» / Хомечный // Там же
18. Ш-н, М. День отдыха – среда / М. Ш-н // Коммунист. – 1923. – 4 мая.
19. לעווין, ל. די קלעריקאלן קריכן ארויס / ל. לעווין // וויטעבסקער ארבעטער. – 1927. – 25 יון
20. ראבקין, א. פירן, סיסטעמאטיש אנ אנטירעליגיעזע ארבעט / א. ראבקין Комуніст. – 1935. – 11 кастр.

**Сідорэнка В.М.**

## ВОБРАЗ КАСЦЁЛА НА СТАРОНКАХ ГАЗЕТЫ “ORKA” Ў 1920-я гг.

Матэрыялы перыядычнага друку 1920-1930-х гг. змяшчаюць каштоўныя крыніцы па гісторыі польскага насельніцтва БССР. У міжваенны час адбывалася станаўленне і фарміраванне савецкай прэсы не толькі як носьбіта інфармацыі, але перад ўсім як сродка ідэалагічнага ўплыву. Негледзячы на тое, што савецкая прэса ніколі не ставіла перад сабой мэту аб’ектыўна адлюстроўваць рэчаіснасць, пры пэўных навуковаметадалагічных захадах, магчыма выкарыстанне матэрыялаў перыядычнага друку міжваеннага часу ў якасці каштоўнай крыніцы. Сярод мноства газет 1920-1930-х гг. звернем увагу на польскамоўную “Orku”. Яна з’яўлялася штотыднёвым друкаваным органам польбюро ЦК КП(б)Б і арыентавалася на сельскае польскае насельніцтва БССР. Газета выходзіла з 1926 па 1937 г. Яе папярэднікам была “Polska Prawda”, арганізаваная ў 1919 г. ў Мінску. У розны час ў рэдакцыі працавалі: Рагінскі, Б. А. Вансоўскі, Прынц, Клыс, Г. Жарскі, У. Кавальскі, Я. Кірштэйн, С. Гельтман, Ю. Мірэцкі, Р. Бржазоўскі,П. І. Пяско, Я. М. Савіцкая, С. Майхровіч. Большая іх частка удзельнічала ў рэвалюцыйных падзеях 1917 г., працавала ў польскім бюро ЦК КП(б)Б. Напрыклад, Стэфан Гельтман ў снежні 1917 г. узначаліў камісарыят па польскіх справах Заходняй вобласці і фронта [1]. Ён уваходзіў у склад рэдакцыі газеты “Polska Prawda”, садзейнічаў усталяванню савецкай улады, выступаў супраць акупацыі польскімі войскамі Беларусі. Яму належыць мноства артыкулаў у перыядычным друку БССР, ў тым ліку ў газеце “Orka”, “Trybuna radzecka”. Ён уваходзіў у бюро комфракцыі і польскі сектар Інбелкульту [2, л.12]. У 1927 г. выйшла падрыхтаваная ім праца аб удзеле працоўных палякаў БССР ў Кастрычніцкай рэвалюцыі [3]. Разуменне грамадскапалітычных пазіцый, узроўня адукацыі, кваліфікацыі рэдактара газеты дапамагае ў крыніцазнаўчай крытыцы матэрыялаў “Orki”.

“Orka” – важная крыніца пры вывучэнні становішча польскага насельніцтва БССР ў міжваенны час. На яе старонках друкаваліся важнейшыя заканадаўчыя акты, загады і распараджэнні ўраду БССР, ЦК КП(б)Б, іншых органаў улады, што датычыліся палякаў. Газета рэгулярна змяшчала аналітычны матэрыял, крытычныя артыкулы, міжнародную хроніку, агляды важнейшых палітычных падзей савецкай краіны, друкавала матэрыялы рабкораў і селькораў, змяшчала на сваіх старонках аб’явы, літаратурныя творы на польскай мове. Газета мела пастаянную рубрыку - “Stroniczka



Репозиторий ВГУ